

## Паштовы сэрвіс для ўсіх і кожнага

СТАР. 3



## Пра мастацтва з Міхаілам Равуцкім

СТАР. 5



## Праграма тэлебачання на тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў:**

*«Стабільная Беларусь — донар рэгіянальнай бяспекі. Для нас як ніколі актуальнымі з'яўляюцца калектыўныя метады вырашэння міжнародных праблем, заснаваныя на вяршэнстве міжнароднага права, Статута ААН і павагі выбранага шляху развіцця. У сучаснай палітыцы як ніколі актуальна ўменне чуць і разумець адзін аднаго. Большасць крызісаў, сведкамі якіх мы сёння з'яўляемся, у многім узніклі і працягваюць узнікаць з-за дэфіцыту даверу, адмовы ад дыялогу, няздольнасці або нежадання зразумець іншы бок».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19 680,00 | ▼ |
| Еўра | 22 388,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 308,27 | ▲ |
| Укр. грыўня | 790,60 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 109 (28219) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# ЦУДЫ ТЭХНІКІ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**На выставе «Белагра-2016», якая працуе гэтымі днямі ў межах Беларускага аграпрамысловага тыдня, ёсць што паглядзець і дарослым, і дзецям. Напрыклад, экспазіцыі ўзораў тэхнікі, якія прадставілі вядучыя айчынныя вытворцы. На пляцоўцы МТЗ, напрыклад, можна ўбачыць і наймоцныя магутныя трактары, і МТЗ-5, які даўно стаў музейным экспанатам, а таксама паспрабаваць сябе ў ролі трактарыста.**

■ Прыватызацыя жылля



## Незалежная ацэнка — за свой кошт

### А змянення тэрмінаў прыватызацыі насельніцтвам жылля дзяржаўнага фонду не плануецца

**Першага ліпеня ў нашай краіне заканчваецца тэрмін прыёму заяў на прыватызацыю жылых памяшканняў. А вось пасля гэтай даты непрыватызаваныя кватэры будуць пераведзены ў разрад жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання. Колькі ў Беларусі засталося непрыватызаванага жылля? Як вызначаецца яго кошт? Хто мае льготы пры прыватызацыі жылых памяшканняў? На гэтыя і іншыя пытанні на анлайн-канферэнцыі сайта БЕЛТА адказвалі прадстаўнікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі і Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Беларусі.**

### Ускочыць у апошні вагон

Паводле інфармацыі намесніка **міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Генадзя ТРУБІЛЫ**, па стане на 1 чэрвеня ў краіне застаецца 179 868 жылых памяшканняў, якія прадастаўлены людзям па дагаворах найму жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду і якія падлягаюць прыватызацыі. З улікам рашэнняў, што яшчэ прымаюцца аб прыватызацыі, колькасць такіх памяшканняў можа скласці каля 163 тысяч. Такім чынам, прыкладна 93% існуючага жыллёвага фонду знаходзіцца ва ўласнасці грамадзян.

Магчыма, большасць карыстальнікаў непрыватызаванага жылля пачнуць больш актыўна варушыцца менавіта ў апошнія тыдні чэрвеня. Таму Мінжылкамунгас і распрацаваў план мерапрыемстваў, звязаных з завяршэннем працэдуры прыватызацыі дзяржаўнага жыллёвага фонду. У адпаведнасці з ім арганізацыі абавязаны забяспечыць прыём дакументаў у будныя і выхадныя дні да 20.00, а ў апошнія дні месяца, з 27 па 30 чэрвеня ўключна, — з 6.00 да 24.00.

СТАР. 4

■ Абітурыент-2016

## СІСТЭМА БЕЗ «УЦЕЧКІ»,

### або Прыёмная кампанія — справа дзяржаўнай важнасці

**«Сістэма цэнтралізаванага тэсціравання страхуе падчас правядзення ў краіне экзаменацыйнай кампаніі ад любых карупцыйных праяў», — такую думку выказала на пасяджэнні Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзення ўступных іспытаў у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах старшыня дзяржкамісіі, намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Я неаднойчы наведвала Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў, дзе дэталёва вывучала ўсе этапы арганізацыйнай працы па правядзенні цэнтралізаванага тэсціравання, знаёмілася, як адбываецца фарміраванне тэстаў, дастаўка экзаменацыйных матэрыялаў і праверка работ, і таму ўпэўнена, што тут не можа быць ніякай уцечкі інфармацыі, ніякага ўмяшання звонку, — падкрэсліла Наталля Качанава.

СТАР. 3